**Установа адукацыі**
**«Беларускі дзяржаўны педагагічны**
**ўніверсітэт імя Максіма Танка»**

Філалагічны факультэт
Кафедра беларускай літаратуры і культуры

# ІНФЕРНАЛЬНЫЯ МАТЫВЫ І ВОБРАЗЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Курсавая работа
студэнткі 21 групы
2 курса спецыяльнасці
«Беларуская мова і літаратура»
дзённай формы
атрымання адукацыі
_________Краўцовай
Аляксандры Уладзіміраўны

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных
навук, дацэнт
__________Н.В. Заяц

Дапушчана да абароны

Загадчык кафедры ______
_________

Пратакол №_____ад _______2016 г.

Абаронена _______________2016 г.
з адзнакай «___________________»

Мінск, 2016

**ЗМЕСТ**

УВОДЗІНЫ ………………………………………………………..…………..……..3

1 Мастацкае вырашэнне праблемы барацьбы са смерцю
ў аповесці З. Бядулі “Сярэбраная табакерка”…………………………5

2 Інфернальная праблематыка п’есы Ф. Аляхновіча
“Круці не круці – трэба памярці”…………………………………….…8

3 Рэпрэзентацыя інфернальных матываў у аповесці
У. Караткевіча “Ладдзя Роспачы”……………………………………..11

4 Ідэйна-сэнсавы змест п’есы К. Крапівы “Брама неўміручасці”……18

ЗАКЛЮЧЭННЕ…………………………………………………………………22

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ……………………………......25

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# УВОДЗІНЫ

У літаратуразнаўстве пад інфернальнымі (з латыні – “падземны”, “ніжні”) разумеюць матывы наведвання пекла, сустрэчы героя з замагільным светам і яго жыхарамі. У еўрапейскім слоўным мастацтве падобнымі матывамі прасякнуты такія літаратурныя шэдэўры розных эпох, як “Міф пра Арфея і Эўрыдыку”, “Боская камедыя” Дантэ Аліг’еры і трагедыя “Фауст” Гётэ. Выкарыстанне інфернальных вобразаў і матываў мае даўнюю традыцыю і ў беларускім прыгожым пісьменстве. Яшчэ ў XI–XIII стагоддзях, у эпоху Старажытнай Русі, былі вядомыя творы, дзе так ці інакш рэалізоўвалася замагільная тэматыка. Напрыклад, матыў наведвання іншасвету прадстаўлены ў апокрыфе “Хаджэнне Багародзіцы па пакутах”. У творы расказваецца пра тое, як Багародзіца разам з архангелам Міхаілам і анёламі спусцілася ў пекла, прасіла ў Бога даравацць грэшнікам, Бог паслаў у пекла Хрыста. У апакрыфічнай “Аповесці пра стварэнне Богам Адама” сцвярджаецца, што ў стварэнні чалавека прымала ўдзел не толькі боская, але і д’ябальская сіла. У найбольш арыгінальным драматычным творы беларускага Асветніцтва “Камедыі” (1787) Каятана Марашэўскага адным з самых яркіх вобразаў выступае прадстаўнік іншасвету Чорт, які выпрабоўвае галоўнага героя Дзёмку. У XIX стагоддзі традыцыю звароту да інфернальнай вобразнасці працягнуў Ян Баршчэўскі. Яго кніга “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” (1844–1846) шчыльна населена прадстаўнікамі іншасвету: цмокамі, ваўкалакамі, асташкаўцамі, чарнакніжнікамі. У XX стагоддзі ідэю спаборніцтва чалавека са смерцю ўвасобілі Змітрок Бядуля (аповесць-казка “Сярэбраная табакерка”, 1940), Францішак Аляхновіч (п’еса “Круці не круці – трэба памярці”, 1943), К. Крапіва (п’еса “Брама неўміручасці”, 1974), У. Караткевіч (аповесць “Ладдзя Роспачы”, 1978) і інш.

Пры аналізе названых твораў даследчыкі звярталі ўвагу на інфернальныя матывы і вобразы, аднак спецыяльна іх не вывучалі. Навуковая навізна курсавой работы заключаецца ў тым, што тут ўпершыню праводзіцца літаратуразнаўчы аналіз хрэстаматыйных твораў у новым аспекце.

**Мэта курсавой работы** – даследаваць спецыфіку ўвасаблення інфернальных матываў у беларускай літаратуры, вызначыць адметнасць раскрыцця адпаведных вобразаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Для дасягненне пастаўленай мэты ў рабоце вырашаюцца наступныя **задачы**:

1) выявіць інфернальныя матывы і вобразы ў творах беларускіх пісьменнікаў;
2) прааналізаваць інфернальныя матывы і вобразы, вызначыць іх ідэйна-эстэтычную функцыю;
3) паказаць адметнасць рэалізацыі інфернальных матываў і раскрыцця вобразаў у творах розных аўтараў.

**Прадмет даследавання** – спецыфіка ўвасаблення інфернальных матываў і раскрыцця інфернальных вобразаў у беларускай літаратуры.

**Аб'ект даследавання** – аповесць-казка "Сярэбраная табакерка" З. Бядулі, п'еса "Круці не круці – трэба памярці" Ф. Аляхновіча, п'еса "Брама неўміручасці" К. Крапівы, аповесць "Ладдзя Роспачы" У. Караткевіча.

Курсавая работа складаецца з уводзін, чатырох параграфаў ("Мастацкае вырашэнне праблемы барацьбы са смерцю ў аповесці З. Бядулі "Сярэбраная табакерка", "Інфернальная праблематыка п'есы Ф. Аляхновіча "Круці не круці – трэба памярці", "Ідэйна-сэнсавы змест п'есы К. Крапівы "Брама неўміручасці", "Рэпрэзентацыя інфернальных матываў у аповесці У. Караткевіча "Ладдзя Роспачы"), заключэння і спіса выкарыстанай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Выкарыстанне інфернальных вобразаў і матываў мае даўнюю традыцыю і ў сусветным і беларускім прыгожым пісьменстве. У еўрапейскай літаратуры падобныя матывы сустракаюцца ў творах, напісаных у розныя перыяды (“Міф пра Арфея і Эўрыдыку”, “Боская камедыя” Дантэ Аліг’еры, “Фауст” Гётэ і інш.). У айчынным мастацтве слова інфернальныя матывы і вобразы былі вядомыя яшчэ са старажытнасці (апокрыф “Хаджэнне Багародзіцы па пакутах”, “Камедыя” К. Марашэўскага) і працягвалі развівацца ў наступныя перыяды (“Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” Я. Баршчэўскага). У XX стагоддзі мастацкае ўвасабленне інфернальнай праблематыкі ажыццявілі такія самабытныя творчыя індывідуальнасці, як З. Бядуля (аповесць-казка “Сярэбраная табакерка”), Ф. Аляхновіч (п’еса “Круці не круці – трэба памярці”), К. Крапіва (п’еса “Брама неўміручасці”), У. Караткевіч (аповесць “Ладдзя Роспачы”). Названыя творы сталі аб’ектам нашага даследавання.

У рабоце даследавана спецыфіка ўвасаблення інфернальных матываў у беларускай літаратуры, вызначана адметнасць раскрыцця адпаведных вобразаў, выяўлены інфернальныя матывы і вобразы ў творах беларускіх пісьменнікаў, прааналізаваны інфернальныя матывы і вобразы, вызначана іх ідэйна-эстэтычная функцыя, паказана адметнасць рэалізацыі інфернальных матываў і раскрыцця вобразаў у творах розных аўтараў.
У выніку аналізу мастацкіх тэкстаў і вывучэння літаратуразнаўчых крыніц былі зроблены наступныя высновы:

1. Мастацкае даследаванне інфернальнай праблематыкі кожным пісьменнікам ажыццяўляецца па-свойму і залежыць ад розных фактараў: творчай ідэі, якую аўтар імкнецца ўвасобіць у тэксце; пісьменніцкага тэмпераменту; часу і ўмоў напісання літаратурнага твора. У аповесці-казцы “Сярэбраная табакерка” З. Бядулі ўвасоблены традыцыйны для еўрапейскага фальклору матыў змагання са смерцю. У п’есе “Круці не круці – трэба памярці” Ф. Аляхновіча пастаўлена праблема жыцця народа і ўсяго чалавецтва ў складанай гістарычнай сітуацыі. Аповесць “Ладдзя Роспачы” У. Караткевіча прысвечана даследаванню нацыянальнага характара беларусаў. П’еса “Брама неўміручасці” К. Крапівы ўяўляе сабой роздум аб чалавечнасці і неўміручасці.

2. У аповесці З. Бядулі цэнтральным інфернальным вобразам з’яўляецца Смерць. Яна – не столькі самастойны персанаж, колькі ідэя, адносіны да якой

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

раскрываюць сапраўдную сутнасць персанажаў. Заняволенне смерці стала каталізатарам паводзін прадстаўнікоў розных сфер жыцця, выявіла нежаданне і няўменне чалавецтва жыць у “ідэальным” грамадстве, паказала жорсткасць і крывапжэрнасць чалавечага свету. Аўтар парушае казачныя каноны шчаслівага фінала. Аповесць “Сярэбраная табакерка” з’яўляецца не дзіцячай казкай, як яе ўспрымалі доўгі час, а філасофскім творам з футурыстычна-папераджальным зместам.

3. Мастацкая прастора п'есы Ф. Аляхновіча “Круці не круці – трэба памярці” адначасова і рэалістычная, і казачна-ўмоўная. Фантастычны вобраз Смерці пачынае набываць канкрэтныя рысы персанажа, уключаецца ва ўмоўную будзённасць п'есы. Смерць у нейкай ступені страчвае сваю варожую сутнасць і надзяляецца якасцямі чалавека. Драматург сцірае межы паміж дабром і злом, фіксуе тую каштоўную нявызначанасць, якая ўзнікае са стратай чалавекам маральных арыенціраў. Ф. Аляхновіч сцвярджае ідэю, што ў жыцці людзі часта кіруюцца не розумам, а мімалётнымі парывамі і жаданнямі, і ў выніку гэта можа мець для чалавека (і ўсяго чалавецтва) драматычныя наступствы.

4. У п'есе “Брама неўміручасці” К. Крапіва ўздымае праблему маральнай падрыхтаванасці грамадства да навуковых вынаходніцтваў, адказнасці вучоных за зробленыя імі адкрыцці, ставіць пытанні жыцця і смерці, вартасці асобы, каштоўнасці жыцця. Драматург выпрабоўвае дзёрзкую гіпотэзу: а што, калі чалавек стане раптам уладаром часу, павялічыўшы працягласць свайго жыцця да бясконцасці? Адкрыццё несмяротнасці, паводле К. Крапівы, няздатнае ашчаслівіць чалавецтва. Яно пацягнула за сабой процьму праблем: дэмаграфічных, сацыяльных, псіхалагічных, этычных. У выніку драматург разам прыходзіць да высновы: чалавецтва не падрыхтавана да такога дарунка лёсу, як вечнае зямное жыццё.

5. У аповесці У. Караткевіча спалучаюцца хрысціянская і антычная традыцыі ў абмалёўцы іншасвету, прычым пры відавочным дамінаванні апошняй (вобразы Перавозчыка, Арахны, ракі забыцця, у якой чытаецца алюзія на Сцікс). У “Ладдзі Роспачы” трансфармуецца міф пра Арфея: герой сустракае сваё каханне ў іншасвеце і выводзіць з небыцця не толькі каханую, але і ўсіх сваіх спадарожнікаў. Праз вобраз гэтага героя сцвярджаецца вера ў віталістычную сілу беларуса, у яго здольнасць ажыццявіць неверагоднае і немагчымае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1 Аляхновіч, Ф. Выбраныя творы / Ф. Аляхновіч; уклад., прадм. А. Сабалеўскага; камент. Г. Кажамякіна і А. Сабалеўскага. – Мінск : Бел. Кнігазбор, 2005. –544 с.

2 Бядуля, З. Выбранае / З. Бядуля. – Мінск : Маст. літ. 1973. – 434 с.

3 Васючэнка, П. Таямніца неўміручасці Кандрата Крапівы: да 115-годдзя з дня нараджэння / П. Васючэнка // Роднае слова. – 2011. – № 3. – С. 5–9.

4 Верабей, А. Л. Уладзімір Караткевіч. Жыццё і творчасць / А.У. Верабей ; пад рэд. Т.А. Гарбачэўска. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 271 с.

5 Верабей, А.Л. Абуджаная памяць : нарыс жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча / А.У. Верабей. – Мінск : Маст. літ., 1997. – 256 с.

6 Караткевіч, У. Выбраныя творы / У. Караткевіч ; уклад., прадм., камент. А. Вераб'я. – Мінск : Бел. кнігазбор, 2005. – 672 с.

7 Ковель, У. Камедыі з мяшчанскага жыцця: станаўленне Францішка Аляхновіча як драматурга / У. Ковель // Роднае слова. – 1998. – № 9. – С. 30–37.

8 Крапіва, К. Выбраныя творы : у 2 т. / К. Крапіва. – Мінск : Маст. літ., 1986. – Т. 2.

9 Лаўшук, С. Кандрат Крапіва і беларуская драматургія / С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 252 с.

10 Лаўшук, С. Горыч развітальнай усмешкі: аб камедыі Францішка Аляхновіча "Круці не круці – трэба памярці" / С. Лаўшук // Тэатральная Беларусь. – 1995. – № 4. – С. 2.

11 Лашкевіч, В.А. Змітрок Бядуля – дзецям / В.А. Лашкевіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1986. – 110 с.

12 Лойка, А.А. Змітрок Бядуля / А.А. Лойка // Гісторыя беларускай літаратуры: дакастрычніцкі перыяд : у 2 ч. / А.А. Лойка. 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск, 1989. – Ч. 2. – С. 364–376.

13 Мальдзіс, А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча : партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 230 с.

14 Мельнікава, З.П. "На горне душы…": творчасць Змітрака Бядулі і беларуская літаратура першай трэці XX стагоддзя : манаграфія / З.П. Мельнікава. – Брэст : БрДУ, 2001. – 222 с.

15 Мішчанчук, М. Лёс і творчасць Францішка Аляхновіча / М. Мішчанчук // Мішчанчук, М. Літаратура XX стагоддзя: спроба пераасэнсавання. – Мінск, 1996.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

16 Навуменка, І.Я. Змітрок Бядуля / І. Навуменка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / навук.рэд.: І. Я. Навуменка, В. А. Каваленка. – Мінск, 1999. – Т.1. – С. 237–264.

17 Сабалеўскі А. В. Кандрат Крапіва: постаць і творы. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінс : Нар. асвета, 2003. – 304 с.

18 Сабалеўскі, А. Здзяйсненне – насуперак лёсу: шляхі Францішка Аляхновіча / А. Сабалеўскі // Роднае слова. – 1994. – № 5. – С. 17–26.

19 Харытончык, Р. Драматургічная спадчына Францішка Аляхновіча: спроба сучаснага прачытання [пачатак] / Р. Харытончык // Мастацтва. – 1997. – № 1. – С. 46–50;

20 Харытончык, Р. Драматургічная спадчына Францішка Аляхновіча: спроба сучаснага прачытання [заканчэнне] / Р. Харытончык // Мастацтва. – 1997. – № 2. – С. 18–23.

**Спіс публікацый**

1–А Краўцова, А.У. Інфернальныя матывы ў беларускай прозе (на матэрыяле аповесцей З. Бядулі “Сярэбраная табакерка” і У. Караткевіча “Ладдзя Роспачы”) / А.У. Краўцова // Беларуская літаратура ў культурнай прасторы сучаснага грамадства : мат. Міжнар. навук. канферэнцыі (да 120-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Кандрата Крапівы), Мінск, 3–4 сакавіка 2016 г. / Цэнтр даследаванняў бел. мовы, літ. і культуры НАН Беларусі, Ін-т літаратуразнаўства імя Я. Купалы. – Мінск, 2016. – С. 138–141.

2–А Краўцова, А.У. Інфернальныя матывы ў аповесці Уладзіміра Караткевіча “Ладдзя Роспачы” / А.У. Краўцова // Духоўнае самавызначэнне асобы ў сучасным свеце: да 85-годдзя з дня нараджэння У. Караткевіча : мат. Рэсп. навукова-практ. канф., Брэст, БрДТУ, 26 ліст. 2015 г. (у друку).

3–А Краўцова, А.У. Мастацкае вырашэнне праблемы барацьбы са смерцю ў аповесці З. Бядулі 2Сярэбраная табакерка” / А.У. Краўцова // “Наука – 2016” : мат. Студенч. науч. конф., Гродно, ГрГУ им. Я. Купалы, 12 апр. 2016 г. (у друку).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ